**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народнай песні «Жывіца» Палаца культуры ААТ «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод»**

Ансамбль «Жывіца» пачаў сваю творчую дзейнасць у жніўні 2001 года. Яго заснавальнікам і мастацкім кіраўніком з'яўляецца Мандрык Ірына Уладзіміраўна, выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. За гэты час кіраўнік многае зрабіла каб развіць і пашырыць лепшыя традыцыі ансамбля, зкамплектаваць высокапрафесійны калектыў. Вынікам яе працы заўжды з'яўлююцца канцэртныя выступленні ансамбля– яскравыя, цікавыя і шчырыя. Удзельнікі ансамбля – маладыя людзі, якія з'яўлюцца студэнтамі УА «Мазырскі дзяржаўны музычны каледж».

Народныя песні гучаць у стылізаванай апрацоўцы, што надае творам шмат новых жывых фарбаў і пры гэтым захоўваецца прыродная душа і напеўнасць.

Калектыў з'яўляецца ўдзельнікам розных культурных мерапрыемстваў. Сярод іх: Міжнародны фальклорны фестываль этнакультурных традыцый «Кліч Палесся», XII Рэспубліканскі экалагічны форум, абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі» і інш. Традыцыйная культура і самабытнае майстэрства артыстаў нашай краіны здзіўлялі шматлікіх гасцей з 140 краін свету. Выступленне артыстаў вырабіла незгладжальнае ўраджанне на гледачоў і атрымала высокую адзнаку кіраўніцтва выставы. Па выніках выступленняў «Жывіцы» на імя мастацкага кіраўніка быў дасланы ліст падзякі. У ім, у прыватнасці, гаворыцца: «Народныя таленты прадэманстравалі высокі ўзровень прафесіяналізму, прапаганду беларускай творчасці, уменне дараваць гледачу радасць і клапатлівыя адносіны да беларускай культуры. Творчых поспехаў вам, даўгалецця і хай падзяка гледачоў будзе для вас самай вялікай узнагародай».

Сёння ансамбль адзін з самых запатрабаваных калектываў горада Мазыра.

